ДУА ”Багданаўская пачатковая школа Сенненскага раёна“

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ”РАЗВІЦЦЁ МОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА АСНОВЕ СУРАЗМОЎНІЦТВА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ“

настаўнік пачатковых класаў
Іванова Ніна Мікалаеўна
8 (2135) 50516

Мова дадзена чалавеку, каб праз яе пазнаваць свет. Чытаючы кнігу, чалавек далучаецца да таго, што было, ёсць, будзе; слухаючы, ён таксама пазнае новае; праз вусную і пісьмовую мову імкнецца даведацца як мага больш пра навакольны свет, давесці да іншых свае думкі, пачуцці, перажыванні.

Мова з’яўляецца часткай свядомасці чалавека, яна ўдзельнічае ў фарміраванні думкі і яе выражэнні з дапамогай характэрных для індывідуума моўных сродкаў. Менавіта па гэтай прычыне чалавек ёсць не проста моўная істота, а асоба з індывідуальным моўным партрэтам, здольная асэнсавана, крытычна ўспрымаць і здабываць інфармацыю, пісьменна выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах, захоўваць моўную культуру.

Засваенне беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі закладвае трывалы фундамент моўнай падрыхтоўкі вучняў, які неабходны для працягу навучання і паўнавартаснага далучэння да культурнага жыцця ў грамадстве.

**Актуальнасць вопыту**.

У вучэбнай праграме заяўлена, што галоўнай мэтай навучання з’яўляецца авалоданне вучнямі функцыянальнымі сродкамі беларускай мовы для эфектыўнага выкарыстання ў розных сітуацыях моўных зносін.

У навучальнай дзейнасці ствараецца пэўнае маўленчае асяроддзе, якое матывуе і стымулюе выказванні вучняў на беларускай мове. У пачатковых класах існуе такая праблема, калі недахоп вядомых вучнямі моўных сродкаў не дазваляе ім паўнавартасна ўступаць у суразмоўніцтва.

Практыка паказвае, што навучанне па-ранейшаму грунтуецца на прыярытэце ведаў, уменняў і навыкаў. Гэта датычыць і мовы як вучэбнага прадмета. У працэсе школьнага навучання дзеці засвойваюць у большай ступені веды пра мову, а не саму мову; запамінаюць правілы напісання, скланення, спражэння, практыкуюцца ў іх прымяненні пры выкананні творчых заданняў [9, с. 11].

Што неабходна зрабіць, каб вучні пасля заканчэння пачатковай школы практычна валодалі мовай у межах, вызначаных патрабаваннямі дзяржаўных

адукацыйных стандартаў? Як арганізаваць навучанне, каб яно было даступным і цікавым для дзяцей гэтага ўзросту? Я перакканана, што рашыць гэтыя задачы можна ў тым выпадку, калі працэс навучання мове будзе арыентаваны на авалоданне вучнямі асноўнымі функцыямі мовы: камунікатыўнай (служыць сродкам суразмоўніцтва), пазнавальнай (дае магчымасць думаць і пазнаваць), эмацыянальнай (служыць для выражэння эмоцый, настрою, пачуццяў).

Шматгадовыя даследванні развіцця вуснай мовы малодшых школьнікаў паказваюць, што ўзровень развіцця камунікатыўных навыкаў нізкі ў дзяцей, для якіх беларуская мова з'яўляецца роднай, і тым больш для тых, хто авалодвае гэтай мовай як другой у працэсе навучання. Сярод асноўных прычын, якія тлумачаць няўменне дзяцей валодаць мовай як сродкам камунікацыі, можна вылучыць наступныя:

- адсутнасць маўленчага асяроддзя і сацыяльнай неабходнасці ў выкарыстанні мовы;
- скіраванасць зместу і методыкі навучання на фарміраванне ўменняў і навыкаў чытаць і пісаць;
- недастатковая колькасць спецыяльных практыкаванняў у падручніках;
- недастатковая распрацоўка адпаведнай праблемы ў методыцы навучання мове.

Гэта тэма мяне зацікавіла, і я  рашыла заняцца праблемай развіцця вуснай мовы вучняў на ўроках беларускай мовы на аснове суразмоўніцтва.

**Мэта маёй работы:** стварыць аптымальныя ўмовы на ўроку для развіцця вуснай мовы вучняў  на аснове суразмоўніцтва з выкарыстаннем магчымасцей традыцыйных і сучасных адукацыйных тэхналогій.

Для сябе я акрэсліла наступныя **задачы:**

- прааналізаваць стан праблемы ў педагагічнай тэорыі і практыцы;
- зрабіць адбор тэхналогій, метадаў і прыёмаў работы па развіцці мовы;
- распрацаваць сістэму творчых заданняў на розных этапах урока;

Працягласць работы  склала  чатыры гады з 2021 па 2025.

**Вядучая ідэя** – разумнае спалучэнне традыцыйных і сучасных падыходаў да выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах дазволіць ажыццявіць мэтанакіраванае авалоданне вучнямі функцыянальнымі сродкамі беларускай мовы і ў выніку – павысіць якасць ведаў па прадмеце і стварыць умовы для паспяховай сацыялізацыі асобы.

Як усё пачыналася? Гартаючы старонкі метадычнага часопіса ”Пачатковая школа“, я ўбачыла артыкул М.Г. Яленскага ”Навучанне роднай мове на аснове суразмоўніцтва“. Уважліва прачытаўшы яго, я зразумела, што мае патаемныя думкі аб развіцці мовы ператварыліся ў сапраўдную новую методыку, якая ўжо праверана, апрабавана і з поспехам выкарыстоўваецца настаўнікамі пачатковых класаў горада Мінска. Сутнасць гэтай методыкі ў наступным:

- навучанне роднай мове грунтуецца на суразмоўніцтве (бо навучыцца гаварыць па-беларуску вучань можа тады, калі мае суразмоўцу і будзе займацца гэтым на кожным уроку);
- навучанне мове арганізуецца не як засваенне гатовых ведаў (настаўнік тлумачыць новы матэрыял) , а як іх здабыча самімі дзецьмі ў працэсе пошукавай дзейнасці пад кіраўніцтвам настаўніка;
- навучанне мове арыентуецца на развіццё differently рознабаковых здольнасцей вучня ў працэсе практычнай дзейнасці;
- навучанне мове будуецца не на выкананні вучнямі фармальных практыкаванняў на спісванне – перапісванне, устаўку літар і г. д., а ў большай ступені на працы з цікавымі і пазнавальнымі маўленчанакіраванымі заданнямі;
- навучанне мове разглядаецца як сумесная творчая дзейнасць настаўніка і вучня ў атмасферы педагагічнай свабоды, пад якой разумеецца своеасаблівае асяроддзе, дзе два суб’екты навучальнай дзейнасці адчуваюць сябе партнёрамі, дзе адсутнічае атмасфера напружанасці, дзе пануе давер і адкрытасць, дзе кожны мае права на пошук, не баючыся памыліцца, бо ацэньваецца не колькасць зробленых памылак, а ўдалыя адказы, знаходкі,

развіццё школьніка на шляху ад няведання і няўмення да ведання і ўмення [9, с.11].

Метадысты прапануюць спалучаць два падыходы: пры выкарыстанні вучнямі сродкаў рускай мовы для кампенсацыі невядомых сродкаў беларускай мовы настаўнік дабразычліва выпраўляе і падказвае патрэбныя моўныя сродкі; настаўнік максімальна забяспечвае выказванні вучняў неабходнымі моўнымі сродкамі (апорныя словы, словазлучэнні) ці сродкамі падтрымкі (слоўнік, падручнік і г.д.).

Для сябе я выбрала некалькі палажэнняў, метадаў і прыёмаў для выкарыстання на ўроках беларускай мовы.

**Апісанне тэхналогіі вопыту.**

Навучанне дзяцей звязнай вуснай мове ажыццяўляецца як на спецыяльных уроках па развіцці мовы, так і на звычайных уроках.

У 1 класе навучанне цалкам скіравана на развіццё маўленча-камунікатыўных здольнасцей.

У 2-4 класах развіццё навыкаў гаварэння мае месца на кожным уроку як асобны этап.

Спынюся на практыкаваннях, якія я выкарыстоўваю на ўроках. Усе практыкаванні я дзялю на 3 асноўныя тыпы:

- моўныя канструктыўныя (складанне сказаў, словазлучэнняў);
- камунікатыўныя (складанне дыялогаў, выказванняў па тэме, гутарка, дыскусія, дзе настаўнік – адзін з удзельнікаў);
- маўленчыя (пераказ, пераклад).

Выказванні дзяцей таксама дзеляцца на групы:

- выказванні на аснове пачутага, убачанага, прачытанага. Яны звязаны з абмеркаваннем інфармацыі, атрыманай з падручніка.

Я звяртаюся да вучняў з такімі словамі: ”Памятаеце, мы чыталі пра…“. Або: ”Памятаеце, калі мы былі на экскурсіі…“. У час такіх выказванняў вучні прыпамінаюць тое, што бачылі, з чым сутыкаліся раней, на аснове гэтага ствараюць уласны тэкст.

- Выказванні абстрактна-тэарэтычнага характару. Яны звязаны з засваеннем тэарэтычнага матэрыялу і прапануюцца пры праверцы дамашняга задання, абагульненні. Тут маецца на ўвазе не пераказ правіла, а разуменне яго сутнасці.

Напрыклад: пры вывучэнні тэмы ”Назоўнік“на этапе замацавання ведаў пытаюся ў дзяцей: ”Для чаго ў мове існуюць словы -стол, -чалавек, -сшытак, -машына і падобныя да іх?“, ”Ці неабходны яны для таго, каб нешта сказаць?“. Адказваючы на пытанні, вучні разважаюць, выказваюць свае меркаванні.

- Выказванні на аснове ўяўленняў. Яны лічацца самымі прадуктыўнымі, трэба стварыць уласны тэкст па сітуацыі, якую трэба ўявіць або выказацца па тэме, якую неабходна раскрыць з дапамогай фактаў, аргументаў, ацэнак. Пры ўвядзенні ў такія сітуацыі я выказваю некалькі супярэчлівых думак, а вучні павінны паразважаць і выказаць сваю пазіцыю.

Напрыклад: Таполя! Дзіўнае дрэва. Самае першае радуе яно чалавека сваімі лісточкамі вясной. Таполя лепш за ўсе іншыя дрэвы ачышчае паветра. Калі зімой некалькі галінак дрэва паставіць ў вазу з вадой і пачакаць, пакуль з’явяцца клейкія лісточкі, ваш пакой напоўніцца цудоўным пахам, карысным для дыхання. А якая таполя летам? Пух таполі вецер заносіць у дамы, кватэры. Становіцца цяжка дыхаць, асабліва хворым людзям. Некаторыя з іх наогул не пераносяць пух і ў гэты перыяд цяжка хварэюць, звяртаюцца за дапамогай у бальніцу. Дык таполя – гэта дабро ці зло? Якія дрэвы вы любіце больш за іншыя і чаму?

Выказваючы свае думкі, дзеці больш думаюць пра сур’ёзнасць сваіх аргументаў, чым пра граматыку. Я выпраўляю памылкі, дапамагаю правільна сказаць па – беларуску.

Для развіцця маўленчай дзейнасці ў дзяцей я выкарыстоўваю на ўроку прыём стварэння розных сітуацый, дзе вучань з’яўляецца суб’ектам ролевай гульні, пры гэтым засвойвае пэўныя граматычныя правілы.

Напрыклад:

- Уявіце, што вы прыйшлі ў госці да сяброўкі, а там аказаліся незнаёмыя людзі. Сяброўка павінна вас з імі пазнаёміць. Разыграйце сцэнку ”Знаёмства“.
- Дайце па тэлефоне параду пра тое, як лепш зварыць макароны. Выкарыстоўвайце словы: спачатку, потым.

Пры навучанні звязнай вуснай мове я выкарыстоўваю і такія прыёмы, як драматызацыя, слоўнае маляванне, мэтамоўную рэфлексію (выпраўленне свайго і чужога маўлення, каменціраванне чужога маўлення).

Трэба яшчэ адзначыць, што ў аснове звязнай вуснай мовы ляжыць правільнае вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў, таму значную ўвагу я надаю выпрацоўцы ў вучняў артыкуляцыйных, фанетычных, інтанацыйных навыкаў. Практыка паказала, што дзеці часта недастаткова на слых улаўліваюць характэрныя асаблівасці беларускага маўлення. З гэтай мэтай я выкарыстоўваю наступныя метадычныя прыёмы: апісанне артыкуляцыі, дэманстрацыя артыкуляцыйнага эталона, чытанне скорагаворак, маўленчая гімнастыка (дадатак 1).

У афармленні вуснай мовы важная роля належыць інтанацыі, таму выхаванне маўленча – камунікатыўнай культуры ўключае ў сябе не толькі аваладанне правіламі літаратурнага вымаўлення, засваення пастаноўкі націску, але і аваладанне такімі сродкамі выразнасці, як мелодыка маўлення, паўза, тэмп, тэмбр голасу [1, с.10]. Для гэтага я вучу дзяцей рэгуляваць: маўленчае гучанне (ціха, гучна, спакойна, ціха), тэмп (павольна, хутчэй, звычайна), тон (перадаць пачуццё, настрой).

Карыстаюся такімі практыкаваннямі:

- паспрабуй расказаць так, каб стала страшна (весела);
- прачытай сказ некалькі разоў, выдзяляючы голасам розныя словы;
- скажы пра адно і тое вучню, які сядзіць за апошняй партай, і вучню, які стаіць побач з табой.

Адным з відаў маўленчай дзейнасці з’яўляецца ўспрыманне мовы на слых. Як паказваюць даследванні, спецыяльнае навучанне слуханню добра

ўплывае на развіццё маўленчага слыху, маўленчай памяці; на фарміраванне вуснай мовы, у прыватнасці яе выразнасці і правільнага вымаўлення. Галоўнымі функцыямі слухання з'яўляюцца: прыём і ўсведамленне інфармацыі, ацэнка інфармацыі, самакантроль (слуханне самога сябе).

Мэты ўспрымання мовы на слых: развіццё здольнасці асэнсавана і актыўна разумець сэнс вуснага выказвання; удасканаленне маўленчага слыху дзяцей; выхаванне культуры слухання.

У адпаведнасці з вызначанымі мэтамі я выпрацоўваю ў вучняў наступныя ўменні: успрымаць інфармацыю цалкам і вылучаць асобныя факты паведамлення, галоўную думку выказвання; запамінаць паслядоўнасць у развіцці падзей і падачы інфармацыі; аналізаваць пачутае ў адпаведнасці з устаноўкай; адэкватна рэагаваць на пачутае; чуць сябе і рэгуляваць сваё маўленне; захоўваць этыку слухання ў час суразмоўніцтва.

Успрыманне мовы на слых найбольш актыўна практыкавалася і практыкуецца ў выкладанні замежнай мовы. Я сама выкладала пэўны перыяд нямецкую мову і карысталася гэтым відам дзейнасці як адным з відаў кантролю. На ўроках беларускай мовы я заўважыла, што, сустрэўшыся з малавядомым ці невядомым словам, дзіця імкнецца знайсці яму адпаведнік з рускай мовы. Працэс разумення сэнсу слова дасягаецца з дапамогай доўгатэрміновай памяці. Асноўны механізм уводу інфармацыі ў доўгатэрміновую памяць – паўтарэнне. Пры гэтым я не паўтараю дзецям адну і тую ж інфармацыю, а вучу дзяцей неаднаразова выкарыстоўваць словы, словазлучэнні ў час адказу на пытанні, пераказу прапанаванай на слых інфармацыі (дадатак 2).

Часта карыстаюся метадам прагназіравання (апераджальнае ўспрыманне тэксту з апорай на папярэдні кантэкст, малюнак).

Напрыклад: перад чытаннем тэксту для пераказа я пытаюся: ”Як вы думаеце, чаму тэкст так называецца? Пра што можа ў ім расказвацца?“

Пры ўспрыманні мовы на слых важная роля адводзіцца такім якасцям маўлення, як тон, гучнасць, тэмп, працягласць інфармацыі. Таму я пільна сачу

за сваім маўленнем. Яно павінна быць дакладным, выразным, з абавязковым захаваннем лагічных паўз, націску. Каб вызначыць хуткасць успрымання прачытанага, спыняюся неаднаразова пры чытанні, перапытваю дзяцей аб пачутым, штосьці ўдакладняю. Што датычыцца працягласці інфармацыі, то 10-12 хвілін дастаткова. Пасля чаго, паводле сведчання псіхолагаў, у дзяцей пачынаецца стамленне. Важным фактарам пры ўспрыманні мовы на слых з'яўляецца накіраванасць увагі вучняў. Увага фарміруецца з дапамогай мэтавай установкі. Так, пры слуханні казкі, я карыстаюся такімі словамі:

- Я вам раскажу, а вы паслухайце і адкажыце на наступнае пытанне…
- Хачу напомніць вам, што…
- Як вы думаеце, што будзе далей?

Звяртаю ўвагу і на выхаванне маўленчай этыкі дзяцей. Я патрабую, каб слухачы глядзелі на таго, хто гаворыць, аналізавалі яго маўленне толькі пасля таго, як выслухаюць да канца. Але, калі вучні сутыкаюцца з сур'ёзнай перашкодай, звязанай з неразуменнем зместу, дазваляю звяртацца з пытаннем і разам знаходзім выйсце. Такім чынам, успрыманне мовы на слых з'яўляецца актыўным працэсам уключэння вучня ў суразмоўніцтва. Вучыць успрымаць і разумець пачутае – адна з важнейшых задач настаўніка ў развіцці мовы.

Чытанне на ўроках мовы.

Чытанне заўсёды прадугледжвае ўспрыманне на слых і суразмоўніцтва. На ўроках беларускай мовы я выкарыстоўваю часцей за ўсё два віды чытання: вучэбна-азнаямляльнае, выразнае.

Перш чым прыступіць да выканання любога практыкавання, вучню неабходна прачытаць яго ўмову для ўсведамлення навучальнай задачы, а затым – матэрыял практыкавання.

Напрыклад: пры вывучэнні тэмы "Словы, якія адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?" я пастаралася ўлічыць чытанне і ўспрыманне мовы на слых у комплексе (дадатак 1).

Трэба адзначыць, што там, дзе на ўроках пісьма выключана чытанне і суразмоўніцтва, пануе нудная, аднастайная работа, якая фарміруе толькі навык, а не актыўную моўную асобу.

**Выніковасць і эфектыўнасць вопыту.**

На працягу работы над тэмай былі атрыманы пэўныя вынікі:

- зроблен аналіз праблемы ў педагагічнй тэорыі і практыцы;
- адабрана сістэма прыёмаў і метадаў работы на розных этапах урока;
- адбылося абагульненне вопыту работы на пасяджэнні раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў пачатковых класаў;
- зроблена "Метадычная капілка";
- вучаніца 3 класа Ерафеева Валерыя ўдзельнічала ў завочным рэспубліканскім конкурсе па беларускай мове "Буслік – 2024" і атрымала дыплом ІІІ ступені.

Назіраліся ў рабоце і негатыўныя моманты. Вынікі, атрыманыя ў працэсе работы, нельга назваць поўнымі, таму што рэфлексія не церпіць спешкі. Для таго, каб убачыць вынікі сваёй работы, трэба дачакацца выпускнога экзамену.

Эфектыўнасць маёй работы праявілася ў наступным:

- на уроках ствараліся сітуацыі для авалодання вучнямі фукцыянальнымі сродкамі беларускай мовы для эфектыўнага выкарыстання ў розных сітуацыях моўных зносін;
- у вучняўназіралася павышэнне інтарэсу да вывучэння роднай мовы.
- развіваліся творчыя здольнасці вучняў. Прыклад таму – стварэнне ўласнага вуснага выказвання (дадатак 3).

**Заключэнне**

Падводзячы вынік ў рабоце над тэмай, я зрабіла наступныя **вывады**:

- практыкаванні па развіцці вуснай звязнай мовы маюць месца на любым уроку і не могуць быць абмежаваны толькі ўрокамі беларускай мовы;
- пры навучанні звязнай мове неабходна даваць дзецям мінімум тэарэтычных звестак, таму што навыкі і ўменні фарміруюцца паспяхова, калі яны асэнсаваны;

- неабходна праяўляць павагу да асобы кожнага дзіцяці, заахвочваць дзяцей выказваць свае думкі і пачуцці, для гэтага выкарыстоўваць жыццёвыя сітуацыі;
- трэба працягваць работу па тэме вопыту ў далейшай практыцы, шукаць новыя шляхі і падыходы да вывучэння роднай мовы на аснове суразмоўніцтва.

Лічу, што кампаненты сістэмы вопыту можна прапанаваць для выкарыстання ў дзейнасці ўсіх педагогаў, якія працуюць у пачатковых класах.

Літаратура:


1. Бязручка, А.Р. Інтанацыя – паказчык выразнага маўлення/А.Р. Бязручка//Пачатковая школа. – 2000. - № 2. – С. 10.
2. Вольская, С.П. Праблемнае навучанне на ўроках беларускай мовы/С.П. Вольская//Пачатковая школа. – 2000. - № 1. – С.9.
3. Какора, А.І. Прыёмы і формы ўзбагачэння слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў/ А.І. Какора // Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2003. – № 1. – С. 3 – 11.
4. Катоўская, І.І. Дыдактычная гульня ”Падарожжа па краіне Грамацеяў“ /І.І. Катоўская//Пачатковая школа. – 2002. - № 6. – С. 29.
5. Лабачэня, Г.Я. Развіццё звязнай пісьмовай мовы вучняў/Г.Я. Лабачэня//Пачатковая школа. – 2003. - № 3. – С.17.
6. Латышава, Н.С. Гульні з загадкамі/Н.С. Латышава//Пачатковая школа. – 2002. - № 10. – С.25.
7. Паўлоўская, В.І. Мова: цікава і займальна: вуч. метад. выданне/В.І. Паўлоўская. – Мінск: Народная асвета, 1989. – 221с.
8. Солахаў, А.В. Рыфмаванкі на ўроках беларускай мовы/А.В. Солахаў//Пачатковая школа. – 2000. - № 4. – С.19.
9. Яленскі, М.Г. Навучанне роднай мове на аснове суразмоўніцтва/М.Г. Яленскі//Пачатковая школа. – 2001. - № 7. – С.11

Дадатак 1

**Фрагмент урока беларускай мовы ў 1 класе.**

Тэма: ”Гук [т] і літара т“

Ход урока:

1. Арганізацыйны момант. Псіхагімнастыка.

- Уявіце шчаня, якое мокне пад дажджом. А цяпер уявіце вінаватага ката, якога пакарала гаспадыня. Паспрабуйце паказаць, як панура ідуць яны па вуліцы, які сумны ў іх выгляд.

- А цяпер усміхніцеся, ваша ўсмешка падыме ім настрой.

2. Работа над тэмай. (Выстаўляюцца цацкі ката і сабакі).

- Знаёмцеся, гэта сабака Тузік, а гэта кот Варкот.

- Прагаварыце мянушкі нашых знаёмых. Які аднолькавы гук чуецца?

- Сення мы разам з Тузікам і Варкотам будзем знаёміцца з гукам [ т] і літарай т.

- Паслухайце загадку: У грудзях гарыць агонь, а бяжыць, нібыта конь. Без аброці, без дугі цягне ў полі ён плугі. (Трактар).

- З якога гука пачынаецца слова – адгадка?

- Што робіць язык, калі мы вымаўляем гук [т]? (Прыціскаецца да верхніх зубоў).

- Паспрабуем праспяваць гэты гук. (Не спяваецца).

- Пакладзіце далонь на горла і вымавіце гук. Галасок спіць ці спявае? (Спіць).

- Значыць гук [т ] - зычны, цвёрды, глухі.

3. Моўная зарадка.

Та – то – ту – ты, ту – то – ты – та.

Ат – от – ут – ыт, ут – ыт – ат – от.

Гульня “ Злаві гук”. (Настаўнік вымаўляе словы, дзеці, пачуўшы гук [т], пляскаюць у далоні). Словы: кот, сон, клён, капуста, хата, дом, кіт, воўк, стол, вада, тэлевізар, рака, трава.

**Фрагмент урока беларускай мовы ў 2 класе.**

Тэма: Словы, якія абазначаюць назвы прадметаў.

Ход урока:

2. Актывізацыя ўвагі, матывацыя.

- Дзеці, сёння на ўроку мы зноў адпраўляемся ў падарожжа па Краіне Грамацеяў, дзе вас чакаюць Каралева Мова, Гаспадар Гук і Гаспадыня Літара, а таксама Гаспадары Правапіс і Слоўнік. А чым будзем займацца, пра што гаварыць, вы зараз даведаецеся. Каралева Мова жадае вам добрага настрою, дружнай працы і дорыць свой верш:

Знікнуць сумныя завеі.

Злягуць злыя маразы.

Цёплай ласкаю павее

На палеткі і лясы.

3. Моўная зарадка.

- Прачытаем верш разам.

- Гаспадар Гук просіць назваць гукі ў слове *цёплай*. (Падкрэсліваю слова).

- Гаспадыня Літара просіць назваць галосныя літары ў слове *завея*.

- Гаспадар Правапіс просіць падзяліць слова *злыя* для пераносу.

- Гаспадар Слоўнік просіць растлумачыць значэнне слова *палеткі.*

4. Хвілінка чыстапісання.

- На дошцы злыя маразы, якія яшчэ не зніклі, намалявалі нейкія ўзоры. Уважліва разгледзьце злучэнні літар і запішыце іх чыста і правільна.

Мм мм ме ме

- А цяпер прыдумаем і запішам словы, у якіх ёсць гэтае спалучэнне літар.

Месяц, медаль, метро

- Прыдумайце сказ з адным з гэтых слоў, лепшы сказ запішам у сшытак.

У Мінску ёсць метро.

- Гаспадар Слоўнік пытаецца ў вас, што такое метро?

- Назавіце яшчэ словы – назвы транспарту.

5. Работа над тэмай. Карэкцыя.

- А зараз Гаспадары Гук і Правапіс пагуляюць з вамі ў гульню ”Адгадай і запішы“. Трэба адгадаць загадку і запісаць правільна адгадку. Хто першым адгадвае, той на дошцы і запісвае. Загадкі:

Ён без фарбаў, без алоўка на акне малюе лоўка лапкі елак, пальмаў вецце,
як жа той мастак завецца? ( Мароз).
З неба ўпаў, усю зямлю абрусам заслаў. (Снег).
З неба крупы падаюць. (Град).
- Адкажыце Гаспадару Правапісу, што трэба зрабіць, каб не памыліцца ў напісанні зычных на канцы слоў? Дзеці ўспамінаюць рыфмаванку: ”Дзе звонкі, дзе глухі пісаць, галосным трэба правяраць“
7. Рэфлексія.
- Ці спадабаўся вам урок?
- Як вы адчувалі сябе на ўроку?
- Дайце ацэнку сваёй рабоце. Даскажыце за мной:
-Я вучыўся на ўроку…
- Я ведаю…
- Я хацеў бы…
**Фрагмент урока беларускай мовы ў 3 класе.**
Тэма: Канчатак. Замацаванне вывучанага.
Ход урока:
2. Моўная размінка. (На дошцы запісаны верш).
Прайдзіся па школах у Мінску, у Гродне,
У Віцебску, Брэсце або Магілёве.
Як хораша дзеткі шчабечуць на роднай,
Сваёй беларускай матульчынай мове.
- Чытаем гучна разам са мной.
- Якімі словамі ў вершы названа мова?
- Якое правіла вы прыгадалі, чытаючы назвы гарадоў?
- Што азначае выраз ”дзеткі шчабечуць“?
- Я таксама хачу, каб вы навучыліся правільна размаўляць на беларускай мове не толькі на ўроках, але і дома, на вуліцы, ў час гульні, у размове паміж сябрамі.
5. Работа над тэмай урока.

- Дзеці, зазірніце праз акно на вуліцу.

- Якая пара года там гаспадарыць?

- Складзіце некалькі сказаў пра восень, пра тое, што адбываецца восенню ў прыродзе.

- Паглядзіце на дошку. Прачытайце шэптам тэкст: *”Наступіць апошні месяц восень. Дрэву стаяць амаль голы.“*

- Вы зразумелі тэкст? Чаму?

- Як выправіць памылкі? (Правільна напісаць канчаткі).

- Прачытайце сказы , правільна ўжываючы канчаткі. Адзін вучань – адзін сказ.

6. Фізкультхвілінка.

- Я зараз буду падаваць каманды, але выконваць іх трэба толькі тады, калі я скажу чароўныя словы ”калі ласка“.

- Устаньце, калі ласка.

- Падыміце рукі ўгору.

- Калі ласка, пацягніцеся.

- Патопайце нагамі і г. д.

- Якія ветлівыя словы вы яшчэ ведаеце?

Разыграйце сітуацыю ”Вучань спазніўся на урок“.

**Чытанне на ўроку беларускай мовы.**

Пры вывучэнні тэмы ”Словы, якія адказваюць на пытанні які? якая?якое? якія?“ я пастаралася ўлічыць чытанне і ўспрыманне мовы на слых у комплексе. Дзецям я кажу:

- Паслухайце тэкст і паспрабуйце знайсці адказы на пытанні: тэкст казачны або не? Пра якога мастака расказваецца ў ім?

”Узяў красавік фарбы и намаляваў неба, а на ім – воблакі. Затым перамаляваў поле. На луг прыснуў плямы. А потым пачаў маляваць дрэвы. Амаль усе фарбы вымаляваў. А тут падбегла да яго бярозка. І памаляваў красавік бярозку. І стала яна нібы дзяўчынка ў сукенцы. Вось які мастак красавік!“

- Дык казачны гэты тэкст ці не? Чаму вы так думаеце? Пра якога мастака ў ім расказваецца? Ці можаце вы ўявіць карціну, якую намаляваў мастак?

- А цяпер прачытайце тэкст практыкавання. Спачатку самі сабе, а потым хтосьці прачытае яго ўголас. Паспрабуйце знайсці адказ на пытанне, ці такі самы тэкст вы толькі што чулі? Вучні чытаюць тэкст: ”Узяў красавік фарбы і намаляваў сінім колерам неба, а на ім белыя воблакі. Затым перамаляваў нуднае поле: дзе ў зялёны, дзе ў жоўты, дзе ў шэры колер. На луг прыснуў рознакаляровыя плямы: тут зялёная пляма, тут белая, тут ружовая. А потым пачаў маляваць дрэвы. Каму чырвоны камель намалюе, каму карычневы, шэры, серабрысты… Амаль усе фарбы вымаляваў, толькі белая засталася. А тут прыбегла да яго бярозка. І памаляваў красавік бярозку ў белы колер. І такая яна стала прыгожая! Нібы дзяўчынка ў белай сукенцы. Вось які мастак красавік!“

- Дык гэта той самы тэкст, што я чытала раней? Што ў ім іншае?

- У якім тэксце больш дакладна, яскрава расказваецца пра справы красавіка?

- На якія пытанні адказваюць словы сіні, зялёная, нуднае, белыя?

- Прачытайце, як красавік-мастак размаляваў неба, запішыце гэтыя словы.

- Спачатку прачытайце, а потым запішыце, якія фарбы спатрэбіліся яму, каб размаляваць дрэвы?

- А як размаляваў красавік поле? Запішыце.

- А луг? Запішыце гэтыя словы.

- Прачытайце запісаныя словы і скажыце, для чаго яны існуюць у нашай мове?

- Сапраўды, каб больш дакладна, выразна, маляўніча апісаць прадмет, неабходна выкарыстаць словы, якія адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?

- Давайце разам падумаем, які загаловак можна падабраць да гэтага тэксту? Пастарайцеся, каб у загалоўку было слова, якое апісвае мастака.

(”Цудоўны мастак“, ”Чароўны мастак“).

- Калі б мастака звалі не красавік, а кастрычнік, якія б тады спатрэбіліся словы, каб апісаць восеньскае неба, поле, луг, дрэвы? Перабудуйце тэкст, прачытайце, што ў вас атрымалася?

- Паспрабуем зараз расказаць пра фарбы любімай пары года. (Расказваю спачатку сама). Дзеці расказваюць пра сваю любімую пару, арыентуючыся з

аднаго боку на мэтавую ўстаноўку – старацца ўжыць як мага больш слоў, якія адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?, а з другога – свабодна імправізуюць, выяўляюць сваё разуменне прыроды.

Так на аснове работы з тэкстам, пры вядучай ролі суразмоўніцтва, я знаёмлю вучняў з функцыяй прыметніка ў мове і аднаразова развіваю мову, уяўленне, навык чытання, гаварэння, успрымання на слых, пісьма.

Дадатак 2

**Работа над сэнсам слова**

Работу па развіцці мовы дзяцей пачынаю з першага дня іх знаходжання ў школе. Практыкаванні, якія спрыяюць развіццю мовы, паступова ўскладняю, па меры пераходу вучняў у наступны клас. Лічу, што выпрацаваныя ў пачатковай школе ўменні і навыкі з’яўляюцца асновай для паспяховага развіцця мовы вучняў у сярэдніх і старшых класах.

Слова – асноўная лексічная адзінка мовы. Кожнае слова разглядаецца на ўроку і як гукавы кампанент, і з пункту гледжання граматыкі. Але перш за ўсё раскрываецца яго сэнс, суадноснасць з прадметам або з’явай рэчаіснасці. Пры рабоце са словам прымяняю такія прыёмы, як дэманстрацыя прадмета, малюнка, муляжа, паказ дзеяння, падвядзенне відавога паняцця пад радавое; увядзенне слова ў сказ; раскрыццё значэння слова пры дапамозе тлумачэння; падбор аднакарэнных слоў; адгадванне загадак; падбор да слоў, якія абазначаюць прадметы, аднакарэнных са значэннем прыметы прадмета і дзеяння (свята, святочны, святкаваць).

Вось, напрыклад, як я працую над словамі:

ЯБЛЫК.

1. Адгадванне загадкі (Румяны Пiлiп да палкi прылiп).
2. Разглядванне малюнка або муляжа.
3. Увядзенне слова ў сказ (У садзе паспелі румяныя яблыкі).
4. Падбор словазлучэнняў (яблычны пах, яблачнае варэнне, яблычны пірог).
5. Апісанне яблыка па прыкметах, яблык які? (форма, памер, колер, смак). Круглы, вялікі, зялёны, кіслы.

6. Калі так гавораць? Яблыку няма дзе ўпасці.

БАГАЦЦЕ.

1. Раскрыццё значэння слова пры дапамозе тлумачальнага слоўніка.

( Багацце – гэта вялікая колькасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. У яго было шмат багацця і слуг. Лес – наша багацце).

2. Падбор сінонімаў (раскоша, заможнасць).

3. Падбор аднакарэнных слоў (багаты, багацей).

4. Падбор антонімаў (беднасць, галеча, жабрацтва).

5. Увядзенне слова ў сказ (У кожнай краіны сваё багацце).

6. Калі так гавораць? Чым багаты, тым і рады.

**Рыфмаванкі на ўроках беларускай мовы.**

Дзеці малодшага школьнага ўзросту не вельмі добра запамінаюць правілы, з цяжкасцю суадносяць тэарэтычны матэрыял з яго практычным прымяненнем. Вершы-запаміналкі прывабліваюць дзяцей сваёй лёгкасцю і рытмічнай арганізаванасцю моўнага матэрыялу, сугучнасцю радкоў. Я прымяняю рыфмаванкі не для падмены правіла, а для папярэджвання арфаграфічных памылак. Пры гэтым я не патрабую іх завучваць на памяць, вучні самаадвольна іх засвояць праз шматразовае выкарыстанне на розных этапах навучання.

*Правапіс вялікай літары ў імёнах:*

Міхась, Андрэйка, Гена, Толя,

Наташа, Света, Люда, Віка –

Пішыце з літары вялікай.

*Правапіс глухіх-звонкіх на канцы слова.*

Дзе звонкі, дзе глухі пісаць,

Галосным трэба правяраць.

Чуеш суп, змяняй – супы,

Пішаш дуб, правер – дубы.

*Правапіс мяккага знака*

Пісьмо, хвалько, гульня, канькі,

Бацькі, цырульня, нацянькі.

Патэльня, ільвяня, смяльчак –

Заўжды пішы праз мяккі знак.

*Правапіс ў*

У нескладовае просіцца пасля галоснага стаць:

Роўны, будоўля, напоўніцца, шоўк, да ўрача, паўтараць.

*Правапіс раздзяляльнага мяккага знака*

Мільярд, мільён, Ульяна, паштальён –

Мы пішам так і толькі так: праз раздзяляльны мяккі знак.

*Правапіс апострафа*

Перад е, ё, я, і апостраф пішацца, сябры.

Вераб'і, кап'ё, сям'я, бар'ер -

Пасля б, п, м і р.

*Правапіс не з дзеясловамі*

Не сваволь, не мані, не пішчы – не з дзеясловам асобна пішы.

*Правапіс падоўжаных зычных*

Гук падоўжаны , не забывайце, праз дзве літары перадавайце:

Жыццё, калоссе, ранне, багацце, назіранне.

*Правапіс е – я*

Зямля, вясна, цяпліца, мядок, вянок, святліца.

Лясок, сястра, дзяўчына. Няма памылак! Малайчына!

**Узбагачэнне мовы фразеалагізмамі.**

Важнай задачай слоўнікавай работы на занятках па беларускай мове ў малодшых класах з'яўляецца ўзбагачэнне і пашырэнне слоўніка вучняў вобразнымі сродкамі мовы. На жаль, праграма пачатковай школы не прадугледжвае спецыяльных урокаў для работы над фразеалогіяй, няма выверанага спісу фразеалагізмаў, рэкамендаваных для засваення малодшымі школьнікамі, не створаны адпаведныя дапаможнікі. А між тым, заданні па гэтай тэме заўсёды ўключаюцца ў спіс алімпіядных заданняў па беларускай мове.

Першаснае азнаямленне з фразеалагізмамі я пачынаю так:

- Дзеці, у нашай мове ёсць спалучэнні слоў, якія нельга разрываць, яны маюць адно цэласнае значэнне. Паслухайце сказ: ”Мама прачнулася ні свет ні зара“.

- Як вы разумееце выраз ”ні свет ні зара“? (прачнулася рана, калі астатнія яшчэ спалі).

- Звярніце ўвагу, як напісаны гэты выраз на дошцы. Ці ёсць у ім знакі прыпынку? Такі выраз называецца фразеалагізмам. Такі выраз нельга скласці самому, яго трэба запомніць.

- А зараз прачытайце сказ, запісаны злева на дошцы ( чытаюць хорам): ”Таню і Насцю вадой не разальеш“. Ці ёсць тут такі выраз? Як разумець яго сэнс? (Яны заўсёды разам. Яны сябруюць і ніколі не сварацца).

- Замяніце фразеалагізмам сказ: ”Андрэй і Артур моцна сябруюць“ (Андрэя і Артура вадой не разальеш). Зноў мы карысталіся тым самым выразам. Пра фразеалагізмы кажуць, што яны нібы пералятаюць са сказа ў сказ. Таму іх называюць ”крылатыя выразы“.

Найбольш эфектыўны прыём засваення фразеалагізмаў – гэта асэнсаванне яго значэння ў кантэксце.

- Даскажыце сказ адным з запісаных у правым слупку выразам.

| | |
|---|---|
| Андрэй слухаў настаўніцу… | з усіх ног |
| Таня кінулася ўцякаць… | адным вухам |
| Ён сядзеў, як… | да ніткі |
| На экскурсіі мы прамоклі… | вады ў рот набраўшы. |

- Замяніце кожны крылаты выраз адным словам.

Дадатак 3

**Вуснае выказванне вучня 3 класа Багданаўскай пачатковай школы Васіленка Арсенія.**

Мая маленькая радзіма

*Я вельмі люблю сваю родную вёску Запруддзе. Я ў ёй нарадзіўся. Тут жывуць мае бацькі, браты,сёстры, мае дзядуля і бабуля. Гэта самыя блізкія мне людзі, я іх усіх люблю. А вёска мая незвычайная. Яна раскінулася між цяністых лясоў і квяцістых лугоў. Для мяне яна прыгожая ў любую пару года.*

*Зімой я люблю яе, пакрытую бялюткім снегам. Быццам чысценькаю белаю ватаю ўсё навокал абкладзена – дарога, дрэвы, кусты. Вясной уся вёска зелянее, расквітае. Раніцай я прачынаюся ад звонкага птушынага спеву. Восенню ў вёсцы цвітуць вяргіні. Чырвонымі і жоўтымі шарамі яны выглядаюць з – за плота. А якой прыгожай вёска выглядае ўлетку! Мы ходзім у лес за ягадамі. Я люблю ісці праз поле, на якім спее жыта. Яно такое высокае, што мяне не відаць! Іду, а ў думках нараджаецца верш:*

*Вёска мая – сонца ў блакіце, васілёк у жыце.*

*Вёска мая – дарагая зямля. Гэта радзіма мая.*

*Я ведаю, што калі выраcту і атрымаю прафесію, абавязкова вярнуся ў сваю родную вёску, на сваю маленькую радзіму, каб не парывалася сувязь пакаленняў, не ўмірала памяць аб роднай зямлі.*